# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 3 (846) | Аўторак, 9 лютага 1993 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 1 руб.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

28-га студзеня г. г. адбылося чарговае пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Першым па парадку дня быў заслуханы і абмеркаваны даклад прарэктара па навуковай рабоце прафесара А. М. Сердзюкова аб выніках навукова-даследчай работы і падрыхтоўкі навукова - педагагічных кадраў за 1992 год і задачах на 1993 год.

На вучоным савеце заслухана інфармацыя дэкана факультэта фізічнай культуры дацэнта Б. М. Зайцава аб арганізацыі навучальнага працэсу па спецыялізацыі «Лячэбная фізкультура і масаж».

Вучоны савет унёс некаторыя змяненні ў Статут ГДУ.

Па конкурсу загадчыкам кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання выбраны дацэнт **М. І. Жадан,** загадчыкам кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці — дацэнт **У. П. Бабына.** Дацэнтам кафедры эканамічных тэорый выбрана **Н. Ю. Дзмітрыева,** старшым выкладчыкам кафедры ўсеагульнай гісторыі — **І. П. Бязручка.** Кандыдат фізіка - матэматычных навук **А. Д. Хадалевіч** з кафедры алгебры і геаметрыі на конкурснай аснове рэкамендаваны да прысваення вучонага звання дацэнт.

## НАРАДА Ў ГАРВЫКАНКОМЕ

У канцы мінулага месяца выканаўчы камітэт Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў правёў нараду рэктараў ВНУ, дырэктараў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і работнікаў гарадскога аддзела адукацыі. Яна была прысвечана праблеме выканання Закона аб мовах у нашай рэспубліцы. Нараду праводзіў намеснік старшыні гарвыканкома А. Ф. Зянчук. У шырокай дыскусіі па абмяркоўваемаму пытанню прынялі ўдзел рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт АН Беларусі Л. А. Шамяткоў і прарэктар па вучэбнай рабоце кандыдат філалагічных навук М. М. Воінаў.

## СТУДЭНЦКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ПРАФСАЮЗАЎ

Міністэрства юстыцыі рэспублікі выдала пасведчанне аб рэгістрацыі асацыяцыі прафсаюзных арганізацый студэнтаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі.

Асноўная мэта дзейнасці новага грамадскага аб'яднання — абарона вучэбна-працоўных, сацыяльна - эканамічных, духоўных правоў і законных інтарэсаў навучэнцкай моладзі ў дзяржаўных органах улады і кіравання.

5-6 лютага на рэспубліканскай нарадзе, праведзенай Міністэрствам адукацыі, рэктары ВНУ Беларусі абмяркоўвалі актуальныя пытанні і праблемы, якія стаяць цяпер перад вышэйшай школай. Пэўнае адлюстраванне яны знайшлі і на старонках «Настаўніцкай газеты», якая ў падрыхтоўчы перыяд да нарады прадставіла слова рэктарам некаторых ВНУ і папрасіла іх адказаць на наступныя пытанні: **1. Якія станоўчыя перамены, на Ваш погляд, адбыліся ў жыцці вышэйшай школы за апошні час? 2. Якія праблемы вышэйшай адукацыі з'яўляюцца, на вашу думку, найбольш актуальнымі?**

На анкету «НГ» даў адказ і рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт АН Беларусі Л. А. Шамяткоў. Яго выступленне, якое мы прапануем увазе чытачоў, было змешчана ў «Настаўніцкай газеце» за 30 студзеня.

# БЕДНАСЦЬ НАША АД НЕРАЗУМНАСЦІ

Мінула больш года з дня прыняцця Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», але наша вышэйшая школа па-ранейшаму знаходзіцца ў стане разгубленасці: маскоўскія путы сарваны (ура! свабода!), а беларускія яшчэ не сплялі. Гэта не сум па кайданах і не папрок міністэрству і ўраду, а простая канстатацыя таго факта, што выкананне артыкула 26 Закона аб адукацыі адносна стварэння дзяржаўна-грамадскай сістэмы кіравання — надзвычай складаная і працаёмкая задача. Адсутнасць прававой базы — гэта не толькі галаўны боль рэктараў, але і адчуванне неабароненасці ў шматтысячнага калектыву работнікаў ВНУ. Нагадаем хаця б праблему забяспечанасці жыллём.

Са свабодай, што звалілася на нас, трэба абыходзіцца асцярожна. Многія ў нас прывыклі кіраваць і даваць парады толькі на аснове здаровага сэнсу, разважнасці. Але ж вельмі даўно яшчэ Канфуцый заўважыў, што роздум без навучання — небяспечны. З адным такім небяспечным роздумам чытач можа пазнаёміцца па артыкулу «Мы будзем жыць не горш, калі...», апублікаваным у газеце «Рэспубліка» 19 студзеня гэтага года. Яго аўтар дацэнт Е. Вераб'ёва ставіць пад сумненне неабходнасць выкладання матэматыкі і прыродазнаўчых навук наогул і патрабуе: «мінімум ведаў — для ўсіх, а для жадаючых — факультатыў». Даруйце, аднак яшчэ старажытныя грэкі даказалі, што вывучэнне матэматыкі — самы лепшы спосаб развіцця мыслення. Для новага прэзідэнта ЗША Клінтана ўсеагульная адукацыя і стварэнне нацыянальнай праграмы па матэматыцы і прыродазнаўчых навуках — важнейшая задача. Сумна, што дацэнт-дактарант гэтага не разумее. Відавочна, не ўсведамляюць гэтага і ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце адукацы. У распрацаваным нядаўна гэтым інстытутам праекце Канцэпцыі выхавання прама сказана, што «наша тэхнічная цывілізацыя нясе ў сабе шмат негатыўных праяўленняў: разбурэнне маральных арыенціраў, сацыяльныя і экалагічныя катаклізмы, узмацненне бездухоўнасці, рост злачыннасці і многае іншае». Вось, аказваецца, хто вінаваты ва ўсіх нашых бедах. Гэта — тэхнары, інтэлектуалы!

Выклікае трывогу тое, як выконваецца Закон аб мовах. У мінулым годзе на яго рэалізацыю нам было асігнавана аж 70 тысяч рублёў. А ў нас ёсць нявыдадзеныя працы на мільёны рублёў. Неразумны фармалізм можа нанесці тут шмат шкоды. Зусім ясна, што Закон аб мовах стварае цяжкасці для беларусаў, пакалечаных таталітарным рэжымам, які адарваў іх ад роднай мовы. Але трэба добра ўяўляць, што той жа Закон можа стаць прававой асновай для спроб каланізацыі нашай рэспублікі. Хацелася б таксама звярнуць увагу і на тое, што пералік прафесій і спецыяльнасцей, па якіх навучанне ўстанаўліваецца на рускай або іншай мове, па Закону зацвярджаецца Саветам Міністраў Беларусі, але гэта не выканана. У літаральным сэнсе выканаць гэта немагчыма хаця б таму, што ў рэспубліцы няма зацверджанага пераліку спецыяльнасцей і прафесій. Акрамя таго, іх назвы пастаянна мяняюцца. А Закон выконваць трэба, няхай не літаральна, але па духу. Лепш за ўсё было б, калі б Савет Міністраў зацвердзіў групы спецыяльнасцей, для якіх магчыма выкладанне асобных прадметаў на рускай або іншай мове. Некаторыя ж дысцыпліны агульнанавуковага плана, на мой погляд, можна і нават патрэбна выкладаць на рускай мове, што якраз не супярэчыць артыкулу 27 Закона аб мовах, дзе гаворыцца аб мове навукі.

Больш за год, як Гомельскі універсітэт не можа атрымаць акт на землекарыстанне ў межах, вызначаных генеральным планам развіцця, зацверджаным на мясцовым і рэспубліканскім узроўнях. Такое ж становішча і ў іншых навучальных установах. Нам кажуць, што да Закона аб зямлі патрэбны падзаконныя акты, якія б вызначалі тэхналогію яго прымянення. А пакуль што дзейнічае ўстарэлае палажэнне, па якім адведзеная зямля можа быць адабрана, калі на працягу двух-трох гадоў на ёй нічога не будуецца. Вось і адкрылі ўжо на тэрыторыі універсітэта касцёл. А хіба ж можна за 2—3 гады стварыць сучасную навучальную ўстанову?

У мінулым годзе на летняй Алімпіядзе ў Барселоне студэнты Гомельскага універсітэта заваявалі чатыры медалі. Алена Рудкоўская ўдастоена залатой узнагароды за перамогу ў плаванні. Гэта выдатнае дасягненне, калі ўлічыць, што універсітэт не мае не толькі плавальнага басейна, але і ніводнага спартыўнага збудавання і добрага стадыёна. Гэта — вынік ранейшай палітыкі, калі ВНУ не дазвалялася нічога, затое розным ведамствам за дзяржаўныя грошы можна было пабудаваць усё, што захочацца. Вось і набудавалі такім чынам ведамасных стадыёнаў, спартыўных комплексаў, палацаў культуры, дамоў адпачынку. Цяпер у газетах можна прачытаць, што такія аб'екты ціха і без рэкламы пераходзяць у прыватныя рукі, а ВНУ, як і раней, застаюцца ні з чым. Гэту праблему можна вырашыць толькі на ўзроўні ўрада.

Як сказаў калісьці Пісараў, беднасць наша ад неразумнасці, а неразумнасць — ад беднасці. Баюся, што гэта прадказанне збудзецца, калі грамадства не ўсвядоміць, што неадукаваная краіна не можа жыць багата.

# АБ ПАМЕРАХ ДЗЯРЖАЎНЫХ СТЫПЕНДЫЙ

Для выканання пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31.12.92 г. № 800 Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва пастанавіў:

Зацвердзіць і ўвесці з 1 студзеня 1993 г. новыя памеры дзяржаўных стыпендый:

1. У вышэйшых навучальных установах:

студэнтам, якія паспяваюць, — у памеры 2400 рублёў у месяц, у тым ліку тым, хто мае толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 2760 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 3120 рублёў у месяц;

студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, знаходзіліся пад апекай (апякунствам), дасягнулі 18-гадовага ўзросту да 1.03.91 г. і не атрымліваюць штомесячных грашовых выплат на ўтрыманне апякаемых (згодна з пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 5.02.91 г.), і якія выхоўваліся ў сем'ях родзічаў, што не афармілі апеку, у памеры 3170 рублёў у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 3530 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 3890 рублёў у месяц;

студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, апекуноў (папячыцеляў), а таксама дзецям ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, — 1970 рублёў у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі, — 2330 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 2690 рублёў у месяц.

Студэнтам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, што знаходзяцца на выхаванні ў апякунскіх (прыёмных) сем'ях і дзіцячых дамах сямейнага тыпу, якія атрымліваюць штомесячныя грашовыя выплаты на іх утрыманне, стыпендыі выплачваюцца на агульных падставах.

Студэнтам, якія знаходзяцца ў адпаведнасці з рашэннямі ўрада на поўным дзяржаўным забеспячэнні, — у памеры 960 рублёў у месяц, у тым ліку студэнтам, якія маюць толькі добрыя, а таксама

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## З ЮБІЛЕЕМ!

**Савет ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл, рэктарат і прафком універсітэта сардэчна віншуюць з 80-гадовым юбілеем ветэранаў вайны і працы Цімафееву Зою Емяльянаўну і Сіманава Вячаслава Рыгоравіча і жадаюць ім моцнага здароўя, бадзёрасці духу і дабрабыту.**

*НАВУКОВЫЯ СТАЖЫРОЎКІ*

# У КРАІНЕ З ДЗВЮМЯ НАЗВАМІ

**(Заканчэнне. Пачатак у № 1).**

ЗНАЕМСТВА з Нідэрландамі ў мяне пачалося з Амстэрдама, горада больш чым з 800-гадовай гісторыяй. Амстэрдам прайшоў шлях ад маленькай рыбацкай вёсачкі да афіцыйнай сталіцы краіны. Вёсачка была заснавана на беразе ракі Амстэл. Для абароны яе ад бушуючага мора спатрэбілася ўзвесці дамбу—па-галандску «дам». Так з'явілася і першая назва горада Амстэлледаме, што ў перакладзе азначае «дамба на рацэ Амстэл».

Люты — не турысцкі перыяд для Амстэрдама. Зімой горад жыве крыху сумным і аднастайным жыццём. Надвор'е ж мяняецца амаль імгненна. Мокры снег, затым вільготны вецер з мора і дождж, потым на пяць хвілін сонца... І так, практычна, па некалькі разоў на працягу кожнай гадзіны. Таму першыя ўражанні былі не самыя добрыя і прыемныя. Чамусьці перш за ўсё запамятаўся першы дзень. Каб дабрацца да горада, давялося зноў вярнуцца ў аэрапорт, а затым на цягніку даехаць да цэнтральнай станцыі Амстэрдама. У Галандыі часцей за ўсё даводзілася карыстацца менавіта чыгуначным транспартам як адным з самых зручных. Расклад цягнікоў складзены так, што з любога пункта можна выехаць на працягу паўгадзіны ў любым напрамку.

□

## АМСТЭРДАМСКІ УНІВЕРСІТЭТ

У міжнародным аддзеле універсітэта г. Амстэрдама мяне сустрэлі вельмі добразычліва. Цярпліва, растлумачваючы па некалькі разоў, далі неабходную на першы час інфармацыю. У далейшым мне не раз давялося пераконвацца ў дзелавітасці і прафесіяналізме супрацоўнікаў гэтага аддзела. Тут усё прадугледжана да драбніц.

Такім чынам, на дзевяць месяцаў я — студэнт матэматычнага факультэта універсітэта г. Астэрдама. Атрымаў сваю першую стыпендыю, з большай часткай якой развітаўся тут жа, і ключы ад пакоя ў інтэрнаце. Праўда, пакой пакуль што толькі на першыя паўтара месяца, аб чым я быў пісьмова папярэджаны. Заплаціць за яго давялося за два месяцы наперад, так званы гарантыйны ўзнос. Універсітэт не мае дастаткова жылля для ўсіх студэнтаў, там нават існуе чарга на яго. Кошт пакоя каля 220 долараў у месяц, амаль столькі, як і ў прыватным сектары. Аднак інтэрнат знаходзіцца ў цэнтры горада, што вельмі зручна, і твае суседзі — студэнты. Канешне, умовы жыцця ў ім адрозніваюцца ад таго, з чым даводзіцца сутыкацца ў нашых інтэрнатах. У тым крыле паверха, дзе я жыў, было 15 пакояў, Суседзі аказаліся ў асноўным галандцы, некалькі іспанцаў, чыліец і сям'я з Паўднёвай Афрыкі. У вольны час, па вечарах, мы часта гутарылі ў прасторнай кухні каля тэлевізара.

У Амстэрдаме няма студэнцкага гарадка. Будынкі універсітэта знаходзяцца ў розных месцах горада, але ў асноўным у цэнтральным раёне. Універсітэту Амстэрдама — 350 гадоў. Гэта не самы старажытны універсітэт у Нідэрландах. У ім вучыцца на сённяшні дзень на 15 факультэтах 27 тысяч студэнтаў. Найбольш прэстыжнымі, на мой погляд, лічацца медыцынскі, стаматалагічны, юрыдычны, эканамічны, сацыялагічны, філалагічны факультэты і факультэт мастацтваў. Кожны з іх мае свой будынак, часам іх некалькі.

Адным з першых ва універсітэце быў заснаваны матэматычны факультэт. Першыя студэнты - матэматыкі з'явіліся тут яшчэ ў XVII стагоддзі. Сёння пяціпавярховы будынак матфака знаходзіцца на ціхай вуліцы, побач з заалагічным садам на беразе маляўнічага канала, дзе часта прама пад вокнамі плавалі лебедзі. Большую частку свайго часу ў Галандыі я правёў менавіта тут, у гэтым утульным месцы.

Маім кіраўніком быў назначаны доктар Рычард ван дэр Валь, адзін са старэйшых дацэнтаў матэматычнага факультэта. Цяпер я з удзячнасцю ўспамінаю аб яго дапамозе і нашай сумеснай рабоце. На сваё вялікае здзіўленне я ўбачыў, што для студэнтаў на факультэце ёсць усяго толькі адна лекцыйная зала, некалькі вялікіх камп'ютэрных класаў і толькі чатыры аўдыторыі. Усе астатнія пакоі займаюць выкладчыкі. Кожны доктар мае асобны кабінет з дошкай. Аспіранты могуць сядзець па два чалавекі ў пакоі, але стол і камп'ютэр кожнаму — гэта там прабавязкова. Ты можаш працаваць у сваім пакоі з 8.00 да 23.00 у буднія дні і з 8.00 да 17.00 — у суботу. На факультэце адсутнічаюць кафедры. Ёсць некалькі вядучых спецыялістаў, у асноўным гэта даволі маладыя прафесары. Ніколі не даводзілася сустракаць там больш двух дактароў, якія працуюць па адной тэматыцы. Прыём на работу ажыццяўляецца па кантракту. Прычым, часцей за ўсё на тры-чатыры гады. Прынята запрашаць ва універсітэт вядомых вучоных для работы на 1—2 гады. Усё накіравана на абнаўленне, больш за ўсё там баяцца застою ва ўсім. Многія выкладчыкі і супрацоўнікі штодзённа прыязджаюць на работу ва універсітэт з іншых гарадоў, часам размешчаных далёка ад Амстэрдама. Так, Рычард ван дэр Валь штодзённа прыязджаў на работу на цягніку амаль за 200 км. Дыпломаў дацэнта і прафесара там няма. Таму працуючы на пасадзе прафесара, трэба выконваць нагрузку прафесара, на пасадзе дацэнта — нагрузку дацэнта. Права на высокую зарплату дае якасць тваёй працы. А працаваць галандцы умеюць і любяць. Прычым, гэта можна сказаць не толькі аб выкладчыках, але і аб студэнтах. Выпадковыя людзі на факультэце, як правіла, не затрымліваюцца. Усяго летась на І курс было прынята 34 студэнты-матэматыкі, а закончылі вучобу, здаецца, 14 чалавек. Гэта з улікам таго, што тут адсутнічаюць уступныя экзамены. Кожны жадаючы, канешне, з адпаведнай адукацыяй можа прыйсці вучыцца ва універсітэт. За вучобу трэба плаціць. Маладыя людзі з малазабяспечаных сем'яў могуць вучыцца за кошт дзяржавы, але потым, калі паступяць на работу, яны вяртаюць затрачаныя на іх грошы.

Амаль палова выпускнікоў мінулага года рыхтавала дакументы для паступлення ў аспірантуру. Сістэма адзнак — дзесяцібальная. Больш за ўсё мяне здзівіла сесія, адсутнасць у час яе дрыжачых маладых людзей перад дзвярыма ў пакой экзаменатара. Тут кожны паважае сябе, а значыць, і сваіх маладых і старэйшых калег. Экзамены ў асноўным пісьмовыя. Прычым, ліст з адзнакай за экзамен, нават за кантрольную работу, дасылаецца выкладчыкам у пісьме студэнту дадому. А калі экзамен вусны, то, як правіла, без пары кубкаў кавы ён не абыходзіцца.

Асобна трэба сказаць аб бібліятэцы. Тут ёсць практычна ўсе спецыяльныя часопісы. Калі патрэбнай вам кнігі не аказалася ў бібліятэцы універсітэта ў Амстэрдаме, то на экране камп'ютэра вы прачытаеце, у якім іншым універсітэце Галандыі вы зможаце яе атрымаць. Наогул, перш за ўсё, у гэтай краіне здзіўляе атмасфера спакою. Яна адчуваецца ў нетаропкім і размераным жыцці галандцаў. Галоўнае — знайсці работу, а для гэтага неабходна атрымаць адпаведную прафесіянальную падрыхтоўку.

□

## СТАЛІЦА НІДЭРЛАНДАЎ

АМСТЭРДАМ лічыцца буйным турысцкім цэнтрам. Сёння ў ім больш 50-ці музеяў і 70-ці тэатраў. Мне не хапіла часу і грошай, каб пабываць у кожным з іх. Але ўбачыў усё ж нямала. Вельмі спадабаліся калекцыі музея Ван Гога і Марскога гістарычнага музея. У Рэйкс музеі выстаўлены многія работы Рэмбрандта, і сярод іх шырока вядомая — «Начны дазор». Гэта славутая карціна, да якой галандцы адносяцца з асаблівым гонарам і любоўю. Але не толькі колькасць музеяў і тэатраў прываблівае турыстаў. Увесь Амстэрдам пранізаны воднымі каналамі. Цяжка паверыць, але сёння ў ім каля 160 каналаў і 1300 мастоў. Агульная працягласць каналаў толькі ў цэнтральнай частцы горада дасягае 110 км. Амстэрдамскія масты амаль усе разводныя. Інакш нельга, каналы і ў ранейшыя часы і зараз суднаходныя. Вузкія вулачкі і набярэжныя, дамы з вострымі дахамі, якія стаяць прама каля вады, і чырвона-белыя фасады — усё гэта стварае асаблівую ўтульнасць і зачараванне Амстэрдама. Амаль кожны будынак мае сваё аблічча, свае ў чымсьці непаўторныя рысы. Старое і новае, вялізнае мадэрновае казіно «Галандыя» і домік Рэмбрандта, усё цесна пераплятаецца на вуліцах горада. Галандцы ахоўваюць і ўтрымліваюць у парадку кожны камень, які мае адносіны да іх гісторыі. У Амстэрдаме не было разбурана амаль нічога, што ўяўляла б сабой нейкую гістарычную каштоўнасць. І ўжо толькі па гэтаму можна меркаваць аб многім, расказваючы аб Галандыі і яе народзе. Ён свята захоўвае свае традыцыі і памятае, адкуль ідуць яго карэнні. У Амстэрдаме, горадзе з 800 тысячамі жыхароў, больш 300 гасцініц. Вы можаце знайсці гасцініцу за 50 і 1500 долараў за суткі. Прычым, у апошняй месцы не пустуюць. Тут прывыклі ўлічваць інтарэсы і грашовыя магчымасці кожнага прыязджаючага.

У памяць аб першай дамбе, якая дала імя гораду, амстэрдамцы назвалі цэнтральную плошчу Дам. На ёй знаходзіцца Каралеўскі палац, у будынку якога доўгі час была гарадская ратуша. На гэтай плошчы мне пашчасціла двойчы на ўрачыстых цырымоніях даволі блізка ўбачыць Беатрыс — каралеву Нідэрландаў. Ад плошчы Дам разыходзяцца цэнтральныя вуліцы і вулачкі са шматлікімі гандлёвымі радамі, рэстаранамі і кафэ, якіх налічваецца па некалькі ў кожным будынку. Тут жа знаходзіцца музей васковых фігур мадам Цюсо і адзін з буйнейшых універмагаў Амстэрдама. Плошча Дам амаль заўсёды шматлюдная. Праз кожныя некалькі мінут на плошчу прыязджаюць новыя групы турыстаў. Цяпер мне здаецца, што аб гэтым горадзе я мог бы расказваць гадзінамі.

Галандцы па-свойму любяць спорт. Тут шмат адкрытых спартыўных пляцовак і тэнісных кортаў, ну і, зразумела, стадыён, на якім праводзіліся Алімпійскія гульні 1932 года.

Расказваючы аб жыцці ў Амстэрдаме, трэба заўважыць, што калі ў цябе ёсць грошы, ты зможаш атрымаць усё, што толькі пажадаеш. Ніякіх чэргаў, ні забарон. Усё можна атрымаць, не выходзячы з дому, заказаўшы па тэлефоне.

Я штодзённа хадзіў па вузкіх вулачках Амстэрдама, па яго мастах і набярэжных. Цяпер я часта ўспамінаю тыя мінуты з сумам і пяшчотай. За дзевяць месяцаў горад стаў для мяне чымсьці блізкім і родным. У ім ёсць штосьці асаблівае, што прымушае цябе спыніцца і задумацца аб жыцці і сваім месцы ў ім.



НА ЗДЫМКУ: каля будынка нацыянальнага музея Нідэрландаў.

**А. КАРМАЗІН,**
**прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт.**

